Падтрымай "Вясну" на PATREON

Сяргей Фалейчык таксама аштрафаваны за інтэрвію

10.11.2017 **Тэгі**: суды, адміністратыўны пераслед, свабода мірных сходаў



Сяргей Фалейчык у судзе. Фота: "Берасцейская Вясна".

У судзе Кобрынскага раёна 9 лістапада разглядалася адміністратыўная справа, заведзеная на **Сяргея Фалейчыка**. Ён таксама даў інтэрв'ю незалежным СМІ, што было расцэнена, як "удзел у несанкцыянаваным мерапрыемстве".

Па інфармацыі "Берасцейскай Вясны", пратакол правапарушэння складзены паводле падзеяў, якія мелі месца ў Менску 21 кастрычніка. У гэты дзень падчас акцыі апазыцыі Сяргей Фалейчык даў інтэрв'ю незалежным СМІ. Гэта і стала падставай дзеля ўзбуджэння адміністратыўнай справы паводле арт. 23.34 КаАП "удзел у несанкцыянаваным

Перад пачаткам судовага паседжання Фалейчык выказаў недавер суду: *“Суду не давяраю, таму як суд прадузяты...”*

Суддзя **Пётр Цімашэнка** адвод не задаволіў: “Законных падстаў для адвода няма, так сама як асабістай зацікаўленасці суддзі”, і пачаў знаёміць прысутных з матэрыяламі справы:

> *“С. Ю. Фалейчык прыняў удзел у Маршы абураных беларусаў у Менску, які быў несанкцыянаваны... Прызнаеце віну?”*

Фалейчык віны не прызнае, кажа, што абвінавачанне не разумее, бо сваім учынкам выказаў сваю грамадзянскую пазіцыю у дачыненні да дзеючай улады: “Я прыехаў у Менск выказаць сваю грамадзянскую пазіцыю. Гэта гарантавана мне заканадаўствам. Дазволу на ўдзел я не лічу патрэбным пытаць, незразумела ў каго пытаць і навошта. Міліцыя нікаго не папярэджвала аб парушэнні заканадаўства. Я абураны тым, што на мяне склалі пратакол, я вольны чалавек...”

Суддзя працягвае чытаць матэрыялы справы: *“21 кастрычніка ў Менску на плошчы а 14-ай гадзіне пачалі збірацца людзі... Пратакол па ч.1 арт 23.34 КаАП... Рапарт намесніка начальніка УБОП з Менску: “На плошчы сабраліся людзі: Статкевіч, Папкова... Плакаты, лозунгі: “Не піліце залаты батон”... і іншыя. Сфармавалі калону, калона павялічылася да 250 чал... Рушылі з плакатамі і транспарантамі... Акцыя забяспечвалася незалежнымі СМІ... Сярод удзельнікаў быў Сяргей Юр’евіч Фалейчык...”*


“Прашу суддзю агучыць галоўны лозунг за які мяне судзяць”,- кажа прыцягваемы да адказнасці Сяргей Фалейчык.


“Лукашэску ты ўрод, хопіць рабаваць народ!” – чытае суддзя, ягоныя словы патанулі ў авацыях.

Суддзя Пётр Цімашэнка вынес пастанову пакараць за ўдзел у неснкцыянаваным масавым мерапрыемстве штрафам у памеры 10 базавых велічынь

Твитнуть







СВАБОДА МІРНЫХ СХОДАЎ


Рэпрэсаваны “Чарнобыльскі шлях". Як шэсце памяці апынулася чарговай нагодай для ціску

"Катаванні сталі ў Беларусі звычайнай справай". Беларускія праваабаронцы — на канферэнцыі АБСЕ

Будаўніка асудзілі да "хатняй хіміі" за ўдзел у Маршы

Заява праваабаронцаў Беларусі аб прызнанні дзевяці палітычных зняволеных

WWW.GAZETABY.CO




ПЕНІНТЭНЦЫЯРНАЯ СІСТЭМА

"Калі адказ не падабаўся, то білі". У СІЗА-1 падчас жорсткай праверкі збівалі вязняў

Палітвязня Вадзіма Гурмана, які мае сур’ёзныя праблемы са зрокам, катуюць у горацкай калоніі

"Гэта была аддушына — сустрэць свайго аднадумца", — былыя палітвязні пра этап у адным вагоне

"КДБ думаў, што мы ботаферма", — былая палітзняволеная па "справе Зельцэра"







АПОШНІЯ НАВІНЫ

"Народжаная пад дубінкамі на Чарнобыльскім шляху". Як пачыналася "Вясна"

Мужчыну асудзілі за ўдзел у Маршы і бойку з прычыны "палітычнай абстаноўкі" у 2020 годзе

У Мінску судзяць стрыечнага брата намесніка камандзіра палка Каліноўскага Вадзіма Кабанчука: пракурор просіць тры гады калоніі

Міжнародная супольнасць віншуе “Вясну” з днём народзінаў

Мужчыну асудзілі на год "хіміі" за сарваны сцяг

"Мы не хочам быць заложнікамі", – вясноўцы на акцыі ў Вільні

Затрыманні і арышты: хроніка палітычнага пераследу 24-26 красавіка (дапоўнена)

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

МАНІТОРЫНГ ПАРУШЭННЯЎ

Ліквідацыя, арышты, суды і выгнанне. Праз 27 гадоў рэпрэсій "Вясна" працягвае сваю дзейнасць

ВЫБАРЧАЯ КАМПАНІЯ

Рэферэндум 2022

ВЫДАННІ







ПАРТНЁРСТВА

Радыё Свабода

Kamunikat
Беларуская інтэрнэт-бібліятэка

Вытокі

ADC Memorial
Anti-Discrimination Centre

Московская Хельсинкская группа

AMNESTY INTERNATIONAL

Міжнародны камітэт па расследаванні катаванняў у Беларусі

Беларуская асацыяцыя журналістаў
baj.by

VOICE OF BELARUS

СЯБРОЎСТВА

EENEMO
European Network of Election Monitoring Organizations

HUMAN RIGHTS HOUSE NETWORK

fidh

